*Д. Я. Дрозд (Мінск, Беларусь)*

# ВОБРАЗЫ-АРХЕТЫПЫ МІФАЛАГІЧНАЙ МАДЭЛІ СВЕТУ Ў БЕЛАРУСКАЙ ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ

Для архаічных міфалогій розных народаў свету характэрна аднолькавая сістэма некаторых сюжэтаў і вобразаў. Не выключэнне і беларуская культура .З часоў сівой мінуўшчыны яна захавала шэраг сусветна вядомых архетыпных сімвалаў. Найбольш частае выкарыстанне гэтых адзінак у беларускай вуснай творчасці абмежавана пэўнымі эпічнымі жанрамі, а таксама замовамі, абрадавай паэзіяй.

Беларускае вяселле вельмі багатае на выкарыстанне ў сваіх рытуалах і песнях сусветна вядомых архетыпных сімвалаў. Нельга ўстанавіць рэзкую мяжу існавання гэтых універсальных адзінак: амаль кожнае абрадавае дзеянне з яго каларытнай песеннай палітрай заключае ў сабе водгукі старажытнай узаемасувязі міфа і рытуала. Адным з такіх першасных вобразаў сусветнай міфалогіі з’яўляецца вобраз Дрэва сусвету ( Вечнае дрэва, Першае дрэва, Дрэва жыцця, Дрэва пазнання), які лёг у аснову адной з мадэляў светабудовы – дэндацэнтрычную. Згодна с ёй, крона дрэва асацыіруецца з небам, ствол – з зямлёй, карані – з пеклам. У беларускай міфалогіі вобраз Дрэва жыцця суадносіцца з вобразам дуба – сімвалам магутнасці, даўгалецця, сувязі трох жыццёвых прастораў. Культ гэтай расліны праяўляецца ў вясельнай песнятворчасці:

Ляцелі гусанькі да дубу,
Клікалі Ясенька да шлюбу…[1, № 1354]

Цэнтральнае месцазнаходжанне каравая на ўрачыстасці, яго ўбранне ( сонца, месяц, зорачкі, птушкі з цеста, вялікая колькасць жывых і штучных кветак) нагадваюць выяву сусветнага дрэва са шматлікімі насельнікамі ўсіх яго сфераў.

Колькі на небе зорачак –
То на караваі шышачак,
Як на небе ясныя –
так на караваі красныя. [1, № 173]

Ай на нашым караваі
Усе птушачкі, што ў раі…[1, № 174]

У вясельных песнях маладую пару часта сімвалізуюць сонца і месяц – вобразы, характэрныя для міфалагічнай мадэлі свету з яе вечнымі супрацьлегласцямі: свет – цемра, дзень – ноч. Рэальны шлюб дзяўчыны і хлопца адпавядае асноўнаму матыву салярных і лунарных міфаў, дзе аб’яднанне нябесных свяцілаў вядзе да ўзнікнення стану гармоніі – своеасаблівай душы і крыніцы існавання сямейнага жыцця (мікракосмасу).

У беларускай вясельнай абраднасці знайшла сваё адлюстраванне і аралагічная мадэль свету, якая звязвае ўсё існуючае з цэнтральнай Сусветнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гарою (вось свету, пуп зямлі). Культ пакланення прыродным узвышанасцям знайшоў сваё месца ў песнях.

Чы чуецеся, конікі, пад сілу?
Падвядзіце пад гару княгіню,
Пад тую гораньку крутую.
Пад тую цэркаўку святую. [1, № 1400]

У пасадным абрадзе, садзячы маладых на “высокае месцечка, на залатое крэслечка”, падкрэслівалі іх часовую (на момант вяселля) перавагу над іншымі, надаючы значэнне цэнтральных вобразаў вяселля.

У шлюбным фальклоры захаваліся рэшткі старажытнага сімвалічнага вобраза лабірынта, вядомага многім народам свету (егіпцянам, грэкам, індзейцам, індусам, персам і інш.)Яго сутнасць у знаходжанні ісціны пасля доўгіх і цяжкіх пошукаў. Фантастычнае апісанне шляху вясельнікаў падобнае на блуканне асобы пры абрадзе пасвячэння па змрочнымх падземных пячорах ці штучна выкладзеных сцежках у пошуках культавай статуі боства, як носьбіта сакральных ведаў. Каб дасягнуць мэты свайго вандравання ( маладой ці каравая), сваты, каравайніцы, дружына маладога, госці пераадольваюць шмат цяжкасцей: “ідуць доўгай дарожанькай грудллівай”, “цераз поле шырокае, гару крутую, ваду быструю”,“лесам глухім”, “балотам топкім”, “ночкай цёмнай”.

У вясельным абрадзе прысутнічаюць элементы старажытных культаў, якія паходзяць з язычніцкіх часоў. Адным з самых старажытных з’яўляецца салярны культ. Да Сонца звярталіся з малітвамі, прасілі ў яго шчасця, здароўя, дабрабыту для маладой сям’і. Асноўныя атрыбуты ўрачыстасці (вянок маладой, шлюбны пярсцёнак, хлебная дзяжа, каравай) прысвячаліся Сонцу. Салярны культ звязаны з пакаленнем аагню з яго ачышчальнай, гаючай, ахоўнай і вяшчальнай сілаю. Гэтым тлумачыцца прысутнасць запаленых свечак на ўсіх вясельных абрадах. Матыў ачышчэння агнём знайшоў месца ў рытуале пераезду вясельнага поезда праз вогнішча, раскладзенае ў варотах.

Не меншую функцыю, чым агонь, адыгрывае вада – сімвал урадлівасці. Умыванне, крапленне вадою, прысутнасць у абрадавых дзействах поўнага кубка засцерагла маладых ад ліхога ўздзеяння, садзейнічала іх здароўю, багаццю, плоднасці.

Культ раслiннасцi на вяселлi тлумачыцца здольнасцю апошняй быць апатрапеямі (палын, шыпшына, крапіва, цыбуля, часнок), спрыяць у каханні (кветкі – сімвал кахання), надзяляць моцным здароўем і даўгалеццем (дуб, елка, сасна).

З культам раслін цесна звязаны культ духаў – апекуноў, якія, па ўяўленнях, жылі ў свяшчэнных дрэвах і надзялялі сваіх прыхільнікаў якасцямі адпаведнай расліны: дзяўчыне спрыяў дух каліны, рабіны, бярозы, яблыні, грушы; хлопцу – дух дуба, явара. Сірочыя вясельныя песні ўтрымліваюць у сабе матыў запрашэння сіратою памерлых бацькоў на вяселле з просьбай благаславіць, надзяліць “гадзінаю шчасліваю, доляю грашовую, хлебнаю, адзёжнаю і ўсялякаю”.Толькі заручыўшыся падтрымкаю

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

насельнікаў незямнога свету, можна было стварыць шчаслівае сямейнае жыццё.

Такім чынам, выяўленне сусветна вядомых вобразаў – архетыпаў у беларускай вясельнай абраднасці дае магчымасць узнавіць не толькі першапачатковы выгляд абраду, але і рэканструкцыяваць сферу светаўспрымання нашых далёкіх продкаў.

1. Вяселле. Песні.Т.2. Мн.: Наука і тэхніка, 1981.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ